Н.М.Лаўрухіна, *дацэнт*

# ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНЫ ПАДБОР МАТЭРЫЯЛУ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА НАРОДНА-СЦЭНІЧНЫМ ТАНЦЫ

Сістэматычная работа па развіцці і ўдасканальванні прафесійных якасцей як абавязковы закон харэаграфічнай адукацыі ў ВНУ ажыццяўляецца на групавых занятках. Для таго, каб студэнт змог глыбей унікнуць у сутнасць прадмета,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

авалодаць ім, педагог ставіць перад ім шэраг задач, якія неабходна вырашаць у працэсе самастойнай работы.

Ужо на ўступных экзаменах вопытны педагог бачыць магчымасці і патэнцыял будучых студэнтаў, а ў працэсе заняткаў вызначае іх схільнасці, інтарэсы. Аналізуючы і класіфікуючы розныя якасці асобы студэнта, педагог вылучае найбольш агульныя, цікавыя рысы і адпаведна здольнасцям, інтэлекту аб'ядноўвае навучэнцаў у групы. Такі дыферэнцыраваны падыход дае яму магчымасць вызначыць стратэгію свайго ўзаемадзеяння з кожнай з іх, падабраць неабходны матэрыял для самастойнай работы па курсе "Народна-сцэнічны танец". Ніжэй даецца прыклад дыферэнцыяцыі студэнтаў першага курса народнага аддзялення на тры ўмоўныя групы.

Першая — студэнты, якія прыйшлі з мастацкай самадзейнасці. У іх добра развіта каардынацыя, ёсць фізічныя даныя, але яны ўпершыню знаёмяцца з прафесійнай тэрміналогіяй і паняццем методыкі выканання рухаў народнага танца. Галоўнай задачай у самастойнай рабоце гэтай групы з'яўляецца мабілізацыя сваіх думак "уголас". Вось, напрыклад, заданне, якое патрабуе апісання цяглічных адчуванняў пры выкананні простых рухаў ля станка. Простымі мы называем рухі з работай, абмежаванай колькасцю цягліц. У дадзеным прыкладзе гэта цягліцы ступні ў практыкаваннях battement tendu, battement tendu jeté. Педагог дае план работы, у які ўваходзіць:

1) даслоўны пераклад з французскай мовы (уся тэрміналогія па харэаграфіі даецца на французскай мове);

2) аналаг рухаў у класічным танцы, што замацоўвае міжпрадметныя сувязі;

3) чарговасць практыкаванняў на ўроку, абгрунтаванне гэтай чарговасці;

4) музычны памер, на які выконваюцца гэтыя практыкаванні, "раскладка" рухаў на музычны лік. Гэта

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дапаможа студэнту лепш разабрацца ў паслядоўнасці работы цягліц;

5) аналіз памылак, якія могуць быць у рухах, і знаходжанне спосабаў іх выпраўлення. Акрамя таго, студэнт знаёміцца з літаратурнымі крыніцамі і іх аўтарамі па народна-сцэнічным танцы.

Другая група — выпускнікі харэаграфічных школ. У адрозненне ад студэнтаў першай групы яны ўжо знаёмы з тэрміналогіяй і асноўнымі паняццямі трэнажу народна-сцэнічнага танца. Але аб'ём ведаў у групе абмежаваны. Тэма для самастойнай работы гэтых студэнтаў "Класіфікацыя і парадак рухаў ля станка для сугрэву цягліц" уключае комплекс усіх практыкаванняў і вымушае студэнта аналізаваць не толькі цяглічныя адчуванні таго ці іншага pas, але і іх чарговасць у трэнажы народна-сцэнічнага танца. Для гэтага навучэнцы класіфікуюць рухі:

1) для работы цягліц ступні (battement tendu, battement tendu jeté, абцасавыя практыкаванні);

2) для развіцця лыткавых цягліц, каленнага і тазасцегнавога суставаў (rond de jambe parterre, battement fondu, passé);

3) для развіцця харэаграфічнага кроку, каардынацыі, гнуткасці (battement développé, grand battement jeté, adagio, расцяжкі).

Кожнай групе рухаў трэба вызначыць задачы, даць абгрунтаванне чарговасці ў трэнажы, параўнальную характарыстыку аналагічных рухаў у класічным танцы. Гэтае заданне прадугледжвае работу з метадычнай літаратурай па народна-сцэнічным і класічным танцах.

Для трэцяй групы студэнтаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю (выпускнікі мастацкіх вучылішч), у якасці самастойнай работы прапаноўваецца матэрыял, звязаны з рэгіянальнымі асаблівасцямі рускага танца. На практычных занятках педагог дае агульны матэрыял рускага танца, дзе

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

галоўная ўвага надаецца тэхніцы і манеры выканання. Курс раздзела рускага танца не прадугледжвае ведання рэгіянальных асаблівасцей. Тэрыторыя Расіі вялікая, і, безумоўна, танец паўночных абласцей (Архангельская, Валагодская) адрозніваецца ад танца паўднёвых (Курская, Варонежская, Арлоўская), таксама як і танец цэнтральных (Маскоўская, Разанская) абласцей ад танцаў Урала і Сібіры. Мэта задання — знайсці і выбраць тыя асаблівасці, якія лепш за ўсё характарызуюць дадзены рэгіён. Для выканання задання спатрэбіцца дапаможнік "Асновы рускага народнага танца" (аўтар А.А.Клімаў), у якім абагульняюцца тэорыя і практыка вядучых харэографаў Расіі. Каб лепш арыентавацца ў мностве матэрыялу, выкладанне яго прапануецца ў наступным плане:

1) геаграфічнае размяшчэнне і гістарычныя карані рэгіёна;
2) строі (касцюм);
3) жанры танцаў, іх назвы;
4) асноўныя рухі ног, рук, корпуса;
5) манера выканання;
6) музычнае суправаджэнне.

Шляхам лагічнага даследавання студэнты адзначаюць, што цяжкія строі поўначы не прадугледжваюць задзірыстай манеры выканання, а, наадварот, патрабуюць сціпласці, якая ў сваю чаргу аказвае ўплыў на адбор рухаў. Гэта простыя хады, дробат невялікім пад'ёмам нагі. Вялікая хустка на плячах скоўвае рухі рук. Малюнак танца лінейны, кругавы, што адлюстроўваецца і ў назвах: "Похаживая", "Столбы", "Застенок". У паўднёвых абласцях Расіі аблегчаныя стракатыя строі даюць волю рухам рук, ног, малюнку танца. Адсюль назвы танцаў "Петелька", "Молодка", "Вертлявка".

Сярэдняя, або цэнтральная, паласа Расіі цікавая шматвобразнасцю музычных тэм: ад павольных, шырокіх да хуткіх, з запалам. Назвы танцаў Цэнтральнай Расіі — "По улице

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

мостовой", "Во лугах", "Разыгрались молодцы". Разнастайны малюнак танца: "круг", "улитка", "капустка", "змея".

У Сібіры і на Урале жывуць прадстаўнікі розных народаў, куда яны былі высланы ў свой час уладамі. Таму ў танцах гэтага рэгіёна прысутнічае змяшэнне характараў і манер выканання паўднёвага і цэнтральнага рэгіёнаў, звязаных з местачковым каларытам.

Прапанаваны падбор матэрыялу акрэслівае кола пытанняў для самастойнай работы студэнтаў. Дыферэнцыраваны падыход дапамагае будаваць навучальны працэс з улікам індывідуальных асаблівасцей і інтарэсаў, стварае ўмовы для самавыяўлення асобы.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ